**Еўмянькоў В.І. (Магілёў)**

# Міфалагічная вобразнасць у паэзіі Максіма Багдановіча: традыцыі літаратуры Беларусі перыяду Асветніцтва

У сітуацыі паскоранага развіцця (азначэнне В. Каваленкі [4]) беларускай літаратуры на пачатку ХХ ст. трэба было абапірацца на пэўныя традыцыі. Для М. Багдановіча своеасаблівым нацыянальным арыенцірам, на наш погляд, была культурная і літаратурная традыцыя, сфарміраваная на мяжы XVIII і XIX стст., – падобная да той, якая існавала ў асяроддзі «краёвых» асветнікаў (навуковыя таварыствы Віленскага ўніверсітэта).

Тое, што гнасеалагічная праблема вырашалася М. Багдановічам згодна з перакананнямі асветнікаў, ужо часткова сцверджана І. Багдановіч («Авангард і традыцыя» [1]). Аднак варта ўсё ж удакладніць: М. Багдановіч, узброены «шкельцам і вокам» Мудраца з Міцкевічавай балады «Рамантычнасць», тым не менш, кіраваўся ў бок як этнаграфічнага, так і класічнага рамантызму. Таму яго «Вянок» паводле асаблівасцей мастацкага метаду – гэта асветніцкі светапогляд, увасоблены ў рамантычнай паэтыцы.

Каб раскрыць феномен Багдановічавай паэзіі, звернемся да асветніцкай традыцыі, увасобленай у творчасці Я. Чачота, і рамантычнай – А. Міцкевіча. Калі Я. Чачот глядзеў на міфалагемы ў тканіне ўласнага літаратурнага тэксту як на факты народнай культуры («Свіцязь», «Бекеш»), праводзячы рэзкую мяжу паміж рэальнасцю і фантастыкай, то малады А. Міцкевіч ідэальнае зрабіў часткаю рэальнага, насяліўшы свае балады («Люблю я», «Рыбка») духамі і прывідамі. М. Багдановіч асэнсаваў гэтыя два падыходы, але абраў уласны шлях адлюстравання ідэальнага.

Лясун, русалкі, вадзянік – вядомыя персанажы славянскай архаічнай культуры. Уводзячы іх у наратыўны кампанент вершаў, М. Багдановіч міжвольна скіроўваў чытача да міфалагічнай свядомасці продкаў (іншымі словамі, набліжаўся да этнаграфічнага рамантызму Я. Баршчэўскага). «Чуеш гул? – Гэта сумны, маркотны лясун / Пачынае няголасна граць: / Пад рукамі яго, навяваючы сум, / Быццам тысячы крэпка нацягнутых струн...» [2, с. 52].

Фальклорныя архетыпы ў М. Багдановіча маюць не міфалагічны, а ў большасці выпадкаў эстэтычны змест. Напрыклад, вобраз лесуна з верша «Над возерам» – не так нацыянальны маркер («жыхар» беларускага Космасу), як «эстэтычная катэгорыя», прызваная не ажывіць схаваныя ў свядомасці архетыпы, а апець прыгажосць, стварыць псіхалагічнае ўражанне. Іншымі словамі, М. Багдановіч вывеў за дужкі прадмет спрэчкі Мудраца і Дзяўчыны са згаданай балады «Рамантычнасць» А. Міцкевіча. Ідэальны свет М. Багдановіча – гэта і не «мёртвая праўда» (матэрыя), і не «жывая праўда» (ідэальная прастора), а сродак адлюстравання і першага, і другога.

Міфалогія як спосаб пазнання свету (што характэрна для «Балад і рамансаў» А. Міцкевіча) у М. Багдановіча набывае характар выключна арнаментальны. Ідэальнае пераводзіцца з катэгорыі веры (гнасеалагічнай катэгорыі) у аб'ект замілавання. Праілюструем гэта на вершы «Грамада зорак «Карона» – Багдановічаў пераклад чатырохрадкоўя (178–182 радкі) з 8-й песні «Метамарфозаў» Авідзія. Пераклад гэты нельга назваць падрадковым. У арыгінале ў 178-м радку згадваецца не Апалон, а Вакх, які сышоў да Мінаіды

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(Арыядны) на востраў Дэлас, дзе пасля забойства мінатаўра яе пакінуў Тэзей. У М. Багдановіча: «Бог Апалон з галавы зняў карону і кінуў у неба. / Ў светлым паветры яна пралятае...» [2, с. 190]. Авідзій апавядае пра тое, што Мінаіда пасля жорсткай здрады каханага ў слязах вымольвае дапамогі ў багоў. Перакладчык абстрагаваўся ад гэтага міфа, пакінуўшы па-за ўвагай змест папярэдніх радкоў. У Авідзія Вакх зняў не карону са сваёй галавы, а «венчык» з пляча Мінаіды. Відавочна, што М. Багдановіч звяртае ўвагу не так на міфалагічны складнік чатырохрадкоўя, як на яго эстэтычнае гучанне – паэта захапіла глыбокая метафара, якая тлумачыла паходжанне з'яў прыроды: зоркі – карона з галавы Апалона.

Тое ж самае датычыцца і іншых вершаў з міфалагічным зместам: «Возера», «Вадзянік», «Бура», «Пугач». Апошні нагадвае быліцу – апавяданне пра выпадак, які здарыўся нібыта з лірычным героем. У першай палове верша канстатуецца факт: «Загарэлісь кроўю вочы. Вось нясецца / З цёмнай елкі гук нуды і смеха» [2, с. 212]. Аўтар пры дапамозе адпаведных вобразных сродкаў (гіпербала, эпітэты, метафары) наўмысна стварае псіхалагічнае напружанне, адухаўляючы лес і ноч, якія раптам зліваюцца ў адну небяспечную для чалавека стыхію. У другой палове верша спачатку падаецца падагульненне: «І, лякаючысь, канца чакаеш ночы», а далей робіцца высновa: «устаў лясун вялікі» [2, с. 212]. М. Багдановіч не проста адухаўляе прыроду, але і ўвасабляе яе варожую для чалавека прастору ў міфалагеме, якая тлумачыць сутнасць падзей, накіроўвае да адпаведных архаічных вераванняў беларусаў. Як вядома, лясун мае здольнасць павялічвацца, а таксама можа напалохаць ці прымусіць блукаць. У гэтым кантэксце «адбіваючыя кроўю вочы» – тыповая прыкмета лесуна, які «пад уплывам хрысціянства набыў рысы незвычайна злога і шкаданоснага нячысціка» [3, с. 72].

Змест двух апошніх радкоў паўтарае змест двух першых. М. Багдановіч парушае логіку верша-васьміраадковіка і звяртаецца да кальцавой кампазіцыі, каб пакінуць разгадку гэтай фантастычнай, на першы погляд, з'явы. Паэт ідзе ўслед за рацыяналістамі эпохі Асветніцтва, якія развенчвалі народныя забабоны. З назвы верша вынікае, што прычына жахаў – усяго толькі лясная птушка. Такі падыход арыентаваўся на асветніцкі мастацкі ідэал і, паводле І. Багдановіч, «свядома адгукнуўся на «дэфіцыт» асветніцкага мастацкага кірунку ў беларускай літаратуры» [1, с. 173].

Аднак не ўсё так адназначна ў паэзіі М. Багдановіча, які дастаткова часта вобразам-міфалагемам надае сімвалічнае значэнне, якое, праўда, не звязана (або звязана толькі ўскосна) з архаічнай культурай. Так, у вершы «Русалка» тэма Бацькаўшчыны раскрываецца ў фантазійна-міфалагічным вобразе русалкі, якая знудзілася «ў глыбіне, ў цішыне» воднай прасторы і марыць аб тым, каб знайсці людскія сляды. Нягледзячы на тое, што «Русалка» была напісана ў культурна-асветніцкі (паводле Р. Жалязняка) перыяд творчасці паэта, калі «М. Багдановіч шырока выкарыстоўваў матэрыял іншых культур» [1, с. 172], у вершы пераважаюць не літаратурныя рэмінісцэнцыі, а засяроджанасць на беларускім фальклоры (на веснавой і летняй абрадавай паэзіі).

Як і ў беларускіх народных вераваннях, Багдановічава Русалказаваблівае ў нетры лесу, пазбаўляе мужчын жыцця: «Як пачну абнімаць, цалаваць, – /

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Будуць біцца, заціхаць, уміраць». Русалка – не трагічна-рамантычная (як, напрыклад, Рыбка або Свіцязянка з аднайменных балад А. Міцкевіча), а свавольная і нават жорсткая: «Хараша ты, ігра, весяла! / Харашы вы, нежывыя цяла» [2, с. 205]. Русалка аддзеленая ад свету людзей (належыць беларускаму міфалагічнаму Космасу), але не пазбаўленая антрапалагічных рыс, як і дзяўчына, яна можа нудзіцца, згадваючы «вясну», класціся ў рэчку, «біцца груддзю», рвацца з вады, рагатаць і г.д. Русалка – раздвоены вобраз, як і лесуны, вадзянікі, змяіныя цары з «зачарованага царства», кажучы словамі В. Каваленкі, яна – «дзіўнае спалучэнне легендарнага, узятага з мясцовага каларыту, і высокай паэтычнасці, літаратурнай прыгажосці» [4, с. 278].

Такім чынам, міфалагічная вобразнасць у прааналізаваных вершах М. Багдановіча набывае адзнакі і эстэтычнай, і філасофскай катэгорыі. Аднак у любым выпадку прырода паэтыкі «Вянка» чужая крытычнаму рэалізму як пануючаму мастацкаму метаду ў «сялянскай» літаратуры Беларусі. М. Багдановіч дужа адрозніваецца ад таго «пакалення Бурачка», пра якое ён згадвае на пачатку артыкула «Глыбы і слаі». Адсюль, магчыма, і скразны матыў адзіноты, характэрны для пазнейшых Багдановічавых вершаў.

Звернемся да верша «Прыйдзецца, бачу, пазайздросціць бяздольнаму Марку...». У першым радку аўтар згадвае «бяздольнага Марку», персанажа адразу некалькіх беларускіх фразеалагізмаў. Часцей за ўсё, Марка – у сэнсе: «пакутнік», «няўдачнік» («Ганяць, як Марку па пекле»). Гэты вобраз можа азначаць як сялянскага хлопца Марку Пякельнага, які падарожнічае па пекле, назіраючы за пакутамі грэшнікаў, так і святога Марка, які па адной з легенд патрапіў замест раю ў пекла і выгнаў адтуль усіх д’яблаў. У трэцім радку першай страфы згадваецца персанаж старажытнарымскай міфалогіі – адна з багінь лёсу («суворая Парка») – хутчэй за ўсё, багіня Дэцыма, якая прадзе нітку «гатунку такога благога»). Паэт накіроўвае чытача як да беларускага фальклору, так і да антычнай міфалогіі, ствараючы звыклую для сябе сітуацыю полікультурнасці.

Заўважаюцца ў вершы і рэмінісцэнцыі з вядомага верша Г. Гейнэ «Тры старыя...». Як і нямецкі рамантык, М. Багдановіч адлюстроўвае прыкрую залежнасць чалавека ад злога лёсу. Бяздольны Марка – у дадзеным выпадку алегарычны вобраз самога паэта, які ў метафарычным сэнсе падарожнічае па пекле жыцця, не бачачы «ні шчасця, ні ўжытку». Шэрыя ніткі ў руках багіні лёсу Паркі – гэта «дні без прасвету, без сонца». Біяграфізм верша бясспрэчны, у ім – як трагічнае прадчуванне хуткай смерці, так і пратэст маладосці супраць наканаванага ціхага, непрыкметнага сыходу: «Хоць бы ты чорную, толькі б не шэрую прала, / Гора жадаў бы, ды толькі каб поўную чарку» [2, с. 309].

**Літаратура**


1. Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя: беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І.Э. Багдановіч ; рэд. В.П. Жураўлёў. – Мінск, 2001.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
3. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. – Т. 2 : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – «Яшчур» ; рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 2006.
4. Каваленка, В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры XIX–XX стагоддзяў / В.А. Каваленка. – Мінск, 1975.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ